**Литература**

1. Из «Защитника мира» («Defensor pacis») Марсилия Падуанского (1324 г.) // Хрестоматия памятников феодального государства и права стран Европы / Под ред. В. М. Корецкого. — М., 1961. — 950 с. — С. 436–440. (по-старому № 10).

2. Der Kurverein von Rense / K. Zeumer // Quellensammlung zur Geschichte der Deutschen Reichsverfassung im Mittelalter und Neuzeit. — Tübingen, 1913. — S. 181–184.

3. Kaiser Ludwig von Bayern Gesetz über die Königswahl / K. Zeumer // Quellensammlung zur Geschichte der Deutschen Reichsverfassung im Mittelalter und Neuzeit. — Tübingen, 1913. — S. 184.

4. Schneidmüller, B. Grenzerfahrung und monarchische Ordnung. Europa 1200 – 1500 / B. Schneidmüller. – München : Verlag C.H. Beck, 2011. — 304 S.

5. Spiller, M. Spurensuche. Zeitgenössische Diskurse und Diskutanten über Probleme in der Reichspolitik des deutschen Spätmittelalters / M. Spiller. — Gießen, 2004. — 268 S.

# Пераходы французскай арміі праз Нёман (24 чэрвеня, 2 снежня 1812 г.) ва ўспамінах ад'ютанта Напалеона Філіпа-Поль дэ Сегюра

*Грэсь А. І., студ. V курса ГрДУ ім. Я. Купалы,*
*навук. кір. праф. Марозава С. В., д-р гіст. навук*

Значэнне ракі Нёман у ваенна-стратэгічных планах вайны паміж Францыяй і Расіяй цяжка пераацаніць. Пераход праз Нёман 24 чэрвеня «Вялікай арміі» Напалеона лічыцца афіцыйным пачаткам Айчыннай вайны 1812 г. для Расіі, у якой Беларусь стала асноўнай арэнай баявых дзеянняў. Успамінам пра пераправу французаў праз Нёман – «реки, наполовину русской, наполовину литовской, но истоки которой всецело русские» [2, с. 292], прысвечаны шматлікія дзённікі, пісьмы, нататкі ўдзельнікаў «Рускай кампаніі 1812 г.». Асаблівую цікавасць выклікае «Гісторыя Напалеона і яго Вялікай арміі ў 1812 годзе» ад'ютанта Напалеона, графа Філіпа-Поль дэ Сегюра.

Сегюр са спачуваннем згадвае тыя далёкія часы, тыя няшчасці, што выпалі на долю прафесійна падрыхтаванага французскага войска. Ён дзякуе ўсім тым афіцэрам і салдатам, якія верна і аддана служылі сваёй Радзіме, хто паклаў за яе свае галовы на Нёмане. Гэта быў вельмі цяжкі шлях — шлях выпрабаванняў [2, с. 14].

Вось яго словы аб першым дні ўступлення ў межы Расійскай імперыі: «У трохсот кроках ад ракі, на самым узвышаным пункце, бачылася палатка імператара. Вакол яе ўсе пагоркі, усе схілы і даліны былі пакрыты людзьмі і коньмі. Як толькі сонца асвятліла ўсе гэтыя рухомыя масы і бліскучае узбраенне, хутка быў дадзены сігнал да выступлення, і імгненна гэтая маса, падзяліўшыся на тры калоны, накіравалася да трох мастоў. Відаць было, як гэтыя калоны, выгінаючыся, спускаючыся па невялікай раўніне, якая аддзяляла іх ад Нёмана, і набліжаючыся да ракі, выцягваліся і скарачаліся, каб перайсці праз масты і дасягнуць чужой зямлі, якую яны збіраліся спустошыць, і хутка самі павінны былі пасеяць сваімі астанкамі» [4, с. 85].

Аб тым, якую колькасць шматнацыянальнага войска, з якім узбраеннем і правіянтам прывёў за сабой Напалеон, можна даведацца з наступных радкоў успамінаў Сегюра: «…Мы ўжо наблізіліся да рускай мяжы. Армія размясцілася перад Нёманам з поўдня на поўнач. На крайнім, правым флангу ад Галіцыі да Драгічына знаходзілася 34 тыс. аўстрыйцаў з князем Шварцэнбергам на чале. З левага фланга, ад Варшавы да Беластока і Гродна, — кароль Вестфальскі з больш чым 79 тыс. вестфальцаў, саксонцаў і палякаў. Побач з імі італьянскі віцэ-кароль, які сцягваў да Марыянпалю і Пілон 79 тыс. баварцаў, італьянцаў і французаў. Затым імператар з 220 тысячным войскам, якім камандавалі кароль Неапалітанскі (Мюрат), прынц Экмюльскі (Даву), герцагі Данцыгскі (Лефеўр), Істрыйскі (Бесьер), Рэджыа (Удзіно) і Эльхінгенскі (Нэй). Ад берагоў Гвадалквівіра і Калібрыі і да самой Віслы былі сцягнутыя 617 тыс. чалавек, з якіх у наяўнасці ўжо знаходзілася 480 тысячаў, затым 6 вазоў з прыладамі для аблогі, мноства вазоў з харчам, незлічоныя чароды быкоў, 1372 гарматы і мноства артылерыйскіх павозак і лазарэтных фургонаў, — усё гэта сабралася і размясцілася ў некалькіх кроках ад рускай ракі» [2, с. 32].

Але хто мог падумаць, што дзень пераходу праз Нёман стане ракавым і для французскай арміі, і для самога Напалеона?

2 снежня 1812 г. вярталася на захад, дадому, праз той жа Нёман ужо не тая «Вялікая армія», а, як пісаў Філіп дэ Сегюр, «некалькі тысяч гаротнікаў, апранутых у лахманы, з панурымі галовамі, патухлым позіркам, мярцвецказямлістымі тварамі і доўгімі, касматымі ад марозу барадамі… Гэта і была ўся "Вялікая армія"!» [3, с. 299].

Такім чынам, дзякуючы успамінам Ф.-П. дэ Сегюра мы можам даведацца пра новыя малавядомыя старонкі вайны 1812 г., убачыць іх вачыма іншаземца, перажыць разам з ім тыя велічныя і трагічныя падзеі двухсотгадовай даўніны. Нёман, дзякуючы Сегюру, стаў знакамітым ва ўсім свеце, але ў большасці — у трагічным аспекце для французаў, як і Бярэзіна. Услед за

рускім афіцэрам Ф. М. Глінкай хочацца ўсклікнуць: «Колькім дзіўным, колькім нечуваным падзеям быў ты сведкаю, велічны Нёман!» [1].


**Літаратура**

1. Интернет-проект «1812 год». Глинка, Ф. Н. Письма русского офицера… [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http:// museum.ru/1812. — Дата доступа : 21.04.2016.
2. Сегюр, Ф.-П. де. Поход в Россию: записки адъютанта императора Наполеона I / Ф.-П. де Сегюр; пер. с франц. Н. Васина, Э. Пименовой. — Смоленск : Русич, 2003. — 442 с.
3. Троицкий, Н. А. 1812. Великий год России / Н. А. Троицкий. — М. : Мысль, 1988. — 348 с.
4. Швед, В. В. Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны / В. В. Швед. — Гродна, 1995. — 176 с.


## Евразийский экономический союз: история и перспективы


*Губаревич В. А., студ. III к. ВАРБ,*
*науч. рук. Воронович В. В., канд. ист. наук, доц.*


Дезинтеграция СССР в 1990-х годах нарушила выстроенные ранее системные экономические связи, что привело к глубокому и длительному социально-экономическому кризису, из которого некоторые постсоветские государства так до сих пор и не вышли. Развалу Советского Союза в наибольшей мере противился Казахстан и некоторые другие азиатские республики СССР. Неслучайно идею формирования Евразийского союза государств впервые выдвинул лидер Республики Казахстан Н. А. Назарбаев 29 марта 1994 года во время выступления в Московском государственном университете им. М. В. Ломоносова.

Первый практический шаг к интеграции был сделан в 1995 году, когда лидеры трех государств подписали Соглашение о Таможенном союзе России, Беларуси и Казахстана [1, с. 8]. Вскоре к договоренностям «таможенной тройки» присоединились Кыргызстан и Таджикистан. В 2000 году «пятеркой» сопредельных государств была создана качественно новая интеграционная структура — Евразийское экономическое сообщество, нацеленная на более тесное сотрудничество на основе унификации нормативной базы и согласования процессов структурной перестройки экономики. В то же время активизировалась и совместная работа по формированию в среднесрочной перспективе унифицированной правовой базы Единого экономического про-